Дзяржава для народа
# Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
21 снежня 2016 г.
№ 21 (384)

АРЫЕНЦІРЫ

## РОСТ ВЫТВОРЧАСЦІ І РАБОЧЫЯ МЕСЦЫ

**На сумесным пасяджэнні сесіі Брэсцкага абласнога Савета і аблвыканкама разгледжаны вынікі работы года, які завяршаецца, і вызначаны задачы на год будучы.**

Акрамя дэпутатаў і членаў выканкама, на выніковае пасяджэнне былі запрошаны старшыні раённых Саветаў дэпутатаў і гаррайвыканкамаў. Мерапрыемства праходзіла ў рэжыме відэаканферэнцыі. Прыняць у ім удзел атрымалі магчымасць кіруючыя работнікі раённага звяна і мясцовыя дэпутаты, бо пытанні, вынесеныя на парадак дня, маюць асаблівую актуальнасць. Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Брэсцкай вобласці ў 2016 годзе падвёў **старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС.** Разам з цяжкасцямі, праблемамі бягучага года губернатар адзначыў і пэўныя набыткі. Яны і сведчаць пра станоўчы зачын на наступны год. Так, па аб'ёме валавога рэгіянальнага прадукту Брэстчына лідзіруе ў краіне.

Адзначана, што ў рэгіёне добра развівался прадпрымальніцтва. Дзякуючы стварэнню новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў працаўладкавана на новыя месцы 6500 чалавек. У складаных умовах, калі экспарт тавараў у Расію і краіны СНД скараціўся, асвоена 9 новых рынкаў збыту. Упершыню тавары з Брэстчыны пайшлі ў Аргенціну, Бразілію, Саудаўскую Аравію, Эквадор, іншыя краіны.

Даволі зладжана працавала сацыяльная сфера. Творчыя калектывы рэгіёна паспяхова выступілі ў 16 краінах свету. Удалося стварыць 1625 дадатковых месцаў у дзіцячых дашкольных установах. У абласной бальніцы праведзена 42 аперацыі па перасадцы ныркі. За ўсім гэтым — вялікая праца адных і пэўны прагрэс у якасці жыцця іншых.

На наступны год вызначаны канкрэтныя задачы па павышэнні эфектыўнасці гаспадарання і развіцці сацыяльнай сферы.

У рабоце сумеснага пасяджэння сесіі і выканкама прыняў удзел **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу краіны Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** У шэрагу іншых задач на новы год і пяцігодку спікер верхняй палаты звярнуў асаблівую ўвагу прысутных на неабходнасць прыцягнення прамых замежных інвестыцый. Паводле яго меркавання, гэта дапаможа надаць новы імпульс у развіцці як буйных сталых прадпрыемстваў, так і невялікіх новых вытворчасцяў.

Сесія разгледзела і зацвердзіла бюджэт вобласці на 2017 год.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## З КАРАГОДАМ І КАЗАЧНЫМІ ГЕРОЯМІ

**Працягваецца навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». У Палацы культуры Кобрына на ёлку сабралася каля 500 хлопчыкаў і дзяўчынак: выхаванцаў дамоў-інтэрнатаў, паспяховых вучняў з горада і раёна, дзяцей са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў.**



Фота БЕЛТА.

Герояў свята цёпла павіншаваў з надыходзячым Новым годам **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** Запаліць ёлку разам з дзецьмі і іх гасцямі паспяшаліся Дзед Мароз са Снягуркай і Зіма. Потым пачался свята з карагодам, песнямі, забавамі.

Міхаіл Мясніковіч пажадаў юным удзельнікам ранішніка і іх бацькам згоды і дабрабыту. Да добрых пажаданняў далучыўся і старшыня Брэсцкага абласнога Савета Сяргей Ашмянцаў.

Пад фінал мерапрыемства ўсе дзеці атрымалі салодкія падарункі. Яшчэ адным падарункам для іх стала тэатралізаваная дзея з удзелам артыстаў Маладзёжнага тэатра эстрады.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

ГАРАДСКАЯ ГАСПАДАРКА

# ЛЮБІШ КАТАЦЦА — ЛЮБІ І ПРЫБІРАЦЦА

## Мінчан абавязалі чысціць снег каля сваіх машын



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў зацвердзіў новыя правілы добраўпарадкавання і ўтрымання горада. Сачыць за выкананнем рашэння №252 будзе пастаянная камісія па гарадской гаспадарцы, транспарце і сувязі.**

Найбольш горача абмяркоўваецца новаўвядзенне, якое тычыцца ўборкі дарогі каля прыпаркаванага аўтамабіля.

Цяпер адказнасць за гэта ўскладваецца на аўтаўладальніка. Ён абавязаны чысціць ад смецця і снегу не менш за метр тэрыторыі праезнай часткі вакол сваёй машыны. Рашэнне закранае тых грамадзян, хто паркуе транспартныя сродкі каля жылых дамоў, уздоўж вуліц і праездаў.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)***

ГРОШЫ

# У НОВЫ ГОД БЕЗ ДАЎГОЎ

### *Падводзім вынікі года па мясцовых бюджэтах*



**Сацыяльна арыентаваная дзяржава — гэта не лозунг, а сухія лічбы і канстатацыя факта. У доказ гэтага намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў — начальнік упраўлення мясцовых бюджэтаў Таццяна АСТРЭЙКА паказвае, што ў гэтым годзе прырост расходаў у галіне адукацыі і аховы здароўя склаў у сярэднім каля 12% у мясцовых бюджэтах. Паводле прагнозаў, на 2017 год тэмп захаваецца. Карэспандэнт «МС» высветліў, з якімі вынікамі заканчваюць год органы мясцовага самакіравання.**

***— Па выніках дзесяці месяцаў гэтага года максімальны бюджэт сельскага Савета перавышае мінімальны ў 83 разы. У Хацежынскага — 1119,7 тыс. рублёў, у Лапаціцкага — 13,5 тыс. рублёў. Як сельскім Саветам дамагацца больш высокіх паказчыкаў?***

— Памер бюджэту пярвічнага ўзроўню сур'ёзна залежыць ад колькасці насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Уплывае і плошча сельсавета, і ўзровень урбанізацыі... Лідзіруючыя пазіцыі па аб'ёме сельскіх бюджэтаў традыцыйна займаюць Хацежынскі і Бараўлянскі сельсаветы Мінскага раёна. У Бараўлянскім пражывае каля 35 тыс чалавек. Замыкаюць спіс бюджэтаў пярвічнага ўзроўню Лапаціцкі і Гіжэнскі сельсаветы Слаўгарадскага раёна. Магілёўскай вобласці. На іх тэрыторыі пражывае каля тысячы жыхароў. Гэта рэгіёны, пацярпелыя ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Сярод іншых фактараў, якія ўплываюць на бюджэт, трэба адзначыць неабходнасць фінансавання буйных нерэгулярных выдаткаў. Напрыклад, такіх, як будаўніцтва інфраструктуры. Тут вялікую ролю грае наяўнасць збераджэнняў. З іншага боку, бясспрэчны той факт, што фінансава незалежныя ад вышэйстаячых улад бюджэты маюць магчымасць фінансавання большага аб'ёму выдаткаў з разліку на аднаго жыхара. Такія выдаткі, як інфраструктурныя, не з'яўляюцца штогадовымі. Яны нерэгулярныя. Калі казаць пра 2016 год, то найбольшы аб'ём рэштак свайго бюджэту аддае на фінансаванне такіх выдаткаў Каладзішчанскі сельскі Савет.

Па сутнасці, многія сельскія Саветы карыстаюцца сваім геаграфічным становішчам. Яны жывуць за кошт рэнты. Другая пазіцыя пасля падаходнага падатку — гэта даходы ад распараджэння зямельнымі ўчасткамі. Натуральна, больш запатрабаванымі з'яўляюцца ўчасткі каля горада Мінска і буйных абласных гарадоў. Перыферыйным раёнам значна цяжэй іх рэалізаваць. Але гэта стымул, каб працаваць лепш і знаходзіць перавагі ў сваім населеным пункце.

***— Выдаткі на адукацыю сёлета складаюць 336,7 рубля з разліку на аднаго жыхара, а на ахову здароўя — 286,6 рубля. Гэта тэндэнцыя павелічэння або памяншэння ў параўнанні з мінулым годам?***

— Выдаткі бюджэту на сацыяльны блок узрастаюць. Тэмп супастаўляльны з узроўнем інфляцыі. Гэта звязана з нягнуткасцю гэтых выдаткаў. Толькі гэтыя дзве сферы фарміруюць палову расходаў мясцовых бюджэтаў.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «МС».)***